УДК 314.117.011-055.2(476.5)"07/10": 930.2

# ЖАНОЧЫ СТРОЙ НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ VIII - ПАЧАТКУ XI СТСТ. ЯК КРЫНІЦА (У КАНТЭКСЦЕ ГІСТОРЫІ ВЫВУЧЭННЯ КУРГАННЫХ СТАРАЖЫТНАСЦЯЎ У XIX СТ.)

**В. М. Тарасевіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь; vikinghouse@mail.ru*

Асэнсоўваецца месца і роля асобных элементаў жаночага строю насельніцтва Беларускага Падзвіння ў вырашэнні праблемных пытанняў, якія існавалі ў першых даследчыкаў-археолагаў на працягу другой паловы XIX ст. Гэты перыяд у развіцці беларускай археалогіі можна назваць «памешчыцкім», калі даследаваннямі займаліся прадстаўнікі заможных слаёў насельніцтва. Менавіта імі быў пакладзены старт назапашванню матэрыялаў для рэканструкцыі жаночага строю насельніцтва Беларускага Падзвіння другой паловы VIII – пачатку XI ст. Высветлена, што даследчыкі другой паловы XIX ст. звярталі ўвагу на асобныя элементы жаночага строю і выкарыстоўвалі іх як этнакультурныя маркёры, паказчыкі гандлёвых сувязяў, як крыніцу па па вывучэнню тэхнік і тэхналогій ювелірнага майстэрства, храналагічныя індыкатары.

***Ключавыя словы:*** жаночы строй; Беларускае Падзвінне; XIX ст.; развіццё археалагічнай думкі; гістарыяграфія; курганныя старажытнасці.

# ЖЕНСКИЙ УБОР НАСЕЛЕНИЯ БЕЛАРУСКОГО ПОДВИНЬЯ ВТОРОЙ ПОЛОВИНЫ VIII - НАЧАЛА XI ВВ. КАК ИСТОЧНИК (В КОНТЕКСТЕ ИСТОРИИ ИЗУЧЕНИЯ КУРГАННЫХ ДРЕВНОСТЕЙ В XIX В.)

**В. М. Тарасевич**

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь; vikinghouse@mail.ru*

Осмысливается место и роль отдельных элементов женского убора населения Белорусского Подвинья в решении проблемных вопросов, которые существовали у первых исследователей-археологов в течение второй половины XIX в. Этот период в развитии беларусской археологии можно назвать «помещичьим», когда исследованиями занимались представители зажиточных слоев населения. Именно ими был положен старт накоплению материалов для реконструкции женского убора населения Белорусского Подвинья второй половины VIII – начала XI в. Выяснено, что исследователи второй половины XIX в. обращали внимание на отдельные элементы женского строя и использовали их как этнокультурные маркеры, показатели торговых связей, как источник по изучению техник и технологий ювелирного мастерства, хронологические индикаторы.

***Ключевые слова:*** женский костюм; Беларуское Подвинье; XIX в.; развитие археологической мысли; историография; курганные древности.

# WOMEN'S EQUIPMENT OF THE POPULATION OF THE BELARUSIAN PLAIN OF THE SECOND HALF OF VIII - THE BEGINNING OF THE XI CENTURY AS A SOURCE (IN THE CONTEXT OF THE HISTORY OF STUDYING MURDER ANCIENTS IN THE 19TH CENTURY)

**V. M. Tarasevich**

*Belarusian State University, Independence Ave. 4, 220030, Minsk, Belarus; vikinghouse@mail.ru*

The place and role of individual elements of the women's dress of the Belorussian Dvina are comprehended in solving the problematic issues that existed among the first archaeological researchers during the second half of the 19th century. This period in the development of Belarusian archeology can be called "landowner" when representatives of the wealthy strata of the population were engaged in research. It was they who laid the foundation for the accumulation of materials for the reconstruction of the women's dress of the population of the Belorussian Dvina in the second half of the 8th - early 11th centuries It turned out that researchers of the second half of the XIX century. drew attention to individual elements of the female system and used them as ethnocultural markers,

indicators of trade relations, as a source for the study of techniques and technologies of jewelry craftsmanship, and chronological indicators.

***Key words:*** women's costume; Belarusian Draft; XIX century; the development of archaeological thought; historiography; mound antiquities.

**Уводзіны.** Мэтай дадзенай работы з’яўляецца асэнсаванне месца і ролі жаночага строю як набору асобных элементаў у вырашэнні праблемных пытанняў, якія існавалі на працягу пачатковага перыяду развіцця беларускай археалагічнай навукі. Паняцце «строй» выкарыстоўваецца як сінонім паняцця «убор». Убор – набор асобных элементаў жаночага строю, якія лепш «археалагізаваліся» (упрыгажэнні, фурнітура, аксэсуары з металу, каменю, шкла). Арганічныя матэрыялы (тканіна, скура і інш.) рэдка фіксуюцца ў матэрыялах пахаванняў, таму дакладна аднавіць адзенне (галоўны элемент жаночага строю) цяжка. У сучаснай археалагічнай навуцы даследчыкі выкарыстоўваюць паняцці «строй» і «убор» як сінанімічныя.

Традыцыйнай крыніцай для рэканструкцыі жаночага строю насельніцтва Беларускага Падзвіння другой паловы VIII – пачатку XI ст. прынята лічыць матэрыялы пахаванняў. Пераважная большасць матэрыялаў для аднаўлення жаночага строю была выяўлена ў курганах. Аднак, у сувязі з апошнімі даследаваннямі, ў якасці крыніц можна выкарыстоўваць і матэрыялы з раскопак бескурганных пахаванняў [1; 7].

**Агульная характарыстыка «памешчыцкага этапу».** Гісторыя даследаванняў курганных могільнікаў на тэрыторыі Беларускага Падзвіння пачынаецца з сярэдзіны XIX ст. Першы, «памешчыцкі», этап працягваўся да пачатку XX ст. Яго можна лічыць тым часам, калі пачынала фарміравацца беларуская археалагічная навука.

Даследчыкамі курганных старажытнасцяў у гэты час былі ўладальнікі зямель, якія займаліся раскопкамі ў межах сваіх тэрыторый. Даследаваннямі курганых старажытнасцяў займаліся прадстаўнікі роду Плятэраў (А. С. Плятэр і У. Плятэр), а таксама К. А. Гаворскі, М. Ф. Кусцінскі, А. М. Семянтоўскі, памешчык Бярновіч, Е. Р. Раманаў і інш. Вядома, што ў пачатку зараджэння археалагічнай навукі даследчыкаў цікавілі не маштабныя гістарычныя рэканструкцыі, а толькі самыя «прадстаўнічыя» рэчы – тыя, якія зараз прынята называць «індывідуальнымі знаходкамі». Адпаведна, некаторыя прадстаўнікі «памешчыцкага этапу» праводзілі свае даследаванні з мэтай сбору археалагічных артэфактаў і далейшага калекцыянавання.

Такі падыход характэрны не для ўсіх прадстаўнікоў гэтага этапу. Можна заўважыць, што некаторыя даследчыкі курганных старажытнасцяў Беларускага Падзвіння спрабавалі аналізаваць атрыманыя імі падчас раскопак матэрыялы: не толькі рэчы, але і такі элемент матэрыяльнай культуры, як пахавальны абрад. Варта адзначыць, што тэарэтычныя канструкцыі, зробленыя даследчыкамі «памешчыцкага этапу», не страцілі сваёй актуальнасці і зараз.

Зараз асобныя элементы жаночага строю выкарыстоўваюцца даследчыкамі як добрыя храналагічныя індыкатары, паказчыкі гандлёвых сувязяў, крыніца па вывучэнню тэхнік і тэхналогій ювелірнага майстэрства а таксама важны маркёр этнакультурных працэсаў. Але, як будзе паказана далей, уключэнне асобных элементаў жаночага строю ў вырашэнне гэтых пытанняў распачалі першыя даследчыкі курганных старажытнасцяў яшчэ ў сярэдзіне XIX ст.

Раскопкамі курганных старажытнасцяў займаўся адзін з пачынальнікаў беларускай археалогіі Я. П. Тышкевіч. Вядомы яго раскопкі ў Барысаўскім, Ковеньскім, Дзісненскім, Віленскім і інш. паветах. У працы даследчыка «О древних могилах в Минской губернии и Литве» (1838) маюцца некаторыя звесткі пра 11 раскапаных ім курганоў у могільніку, які мясцовыя жыхары называлі Шведскія магілы (Барысаўскі павет). Усяго даследчык узгадвае 30 насыпаў [6, с. 51–58].

Акрамя цікавасці да эвалюцыі абраду пахавання (пераходу ад трупаспалення да трупапакладання) і спробай выявіць этнавызначальныя рэчы, даследчык цікавіўся металамі, з якіх зроблены пахавальны інвентар [6, с. 56; 8, с. 58–61]. Я. П. Тышкевіч, абагульняючы матэрыялы па раскапаных ім курганах, прыводзіць звесткі аб жаночым і мужчынскім пахавальным інвентару; у кожнай з гэтых груп ён вылучыў характэрныя наборы рэчаў. Для кожнага прадмета з пахавання Я. П. Тышкевіч

стараўся акрэсліваць тэрыторыю распаўсюджвання і этнічную прыналежнасць. Даследчык першы вылучыў скроневыя колцы ў жаночых пахаваннях як асаблівасць крывіцкіх куганоў [1, с. 5]. Такім чынам, Я. П. Тышкевіча можна лічыць першым з беларускіх археолагаў, хто выкарыстоўваў асобныя дэталі жаночага строю ў якасці этнакультурнага маркёра.

К. П. Тышкевіч вывучаў старажытнасці найперш на тэрыторыі Мінскай губерні, пачынаў з Лагойшчыны. Галоўнай археалагічнай працай з'яўляецца «O kurhanach na Litwie i Rusi zachodniej» (1868). Даследчык лічыў, што жаночыя пахаванні з'яўляюцца самымі багатымі для раскопак, бо «на жанчын пасля смерці апраналі ўсё, што яны мелі пры жыцці» [9, с. 39]. Ён таксама звяртаў увагу на тое, што жаночыя пахаванні найбольш праліваюць святло на «тагачасныя зносіны з іншымі краінамі і на шляхі, якімі ў гэты край пранікалі першыя пачаткі адукаванасці» [9, с. 50]. Такім чынам, К. П. Тышкевіч звярнуў увагу на тое, што асобныя элементы жаночага строю могуць выступаць у якасці паказчыкаў гандлёвых сувязяў.

Упэўнена можна сказаць, што К. П. Тышкевіч адзін з першых, хто паспрабаваў «рэканструяваць» асобныя элементы жаночага строю. Хутчэй за ўсё апісаныя рэчы – рэчы з раскопак пахаванняў па абрадзе інгумацыя. «У старажытных літоўскіх жанчын было ў звычаі падбіраць косы ў тонкія бронзавыя кольцы, а за недахопам іх – у кольцы, вітыя з дроту. На ілбе насілі яны дыядэмы, або абручы ў форме змяі ... то майстэрскія нейкія металічныя пляцёнкі, то нарэшце даўгаватыя выразаныя бляшкі з адбіткамі на іх і рознага роду ўпрыгажэннямі, ахопленыя металічным абручом» [9, с. 50]. «Дахрысціянскія жанчыны насілі бранзалеты, пярсцёнкі, каралі, завушніцы, упрыгажэнні рознага роду і разнастайнай формы, якія насілі на грудзях, як крыжы, медальёны, бляшкі розных формаў і з рознымі ўпрыгожаннямі, нарэшце, костачкі ад пладоў, падвешаныя на шыі. Бронзавы, спіраллю звіты дрот у вялікіх і меншых кавалках, што падзяляў то бусы, то бразготкі ... складалі істотную частку жаночых упрыгажэнняў» [9, с. 62].

Неабходна адзначыць дзейнасць А. М. Семянтоўскага. У 1863 г. па даручэнні губернскага статыстычнага камітэта ён пачаў збор звестак пра старажытныя помнікі. На аснове апытанняў мясцовага насельніцтва, а таксама ўласных падарожжаў і стасункаў з археолагамі-аматарамі, ён сабраў значныя звесткі. Ён абследаваў, а хутчэй за ўсё, магчыма, сам арганізаваў раскопкі некаторых курганных могільнікаў у Віцебска-Полацкім Падзвінні. На думку пра тое, што А. М. Семянтоўскі займаўся раскопкамі ці прысутнічаў пры раскопках пад кіраўніцтвам нейкай іншай асобы, накіроўвае даволі падрабязнае апісанне знойдзеных рэчаў і месца іх ў насыпу [5, с. 15]. Акрамя могільніка Рудня (Полацкі раён), А. М. Семянтоўскі дае падрабязнае апісанне курганных могільнікаў Лепельскага, Полацкага і іншых уездаў [5, с. 13]. Даследчык арганізаваў раскопкі аднаго насыпу з курганнага могільніка каля в. Бядзедавічы (Полацкі раён) і скончыў раскопкі аднаго пашкоджанага кургана па дарозе ў мястэчка Вусце (Полацкі раён) [5, с. 20–21].

У дачыненні да раскапаных ім і іншымі даследчыкамі курганоў у Полацкім і Лепельскім уездах А. М. Семянтоўскі спрабаваў вызначыць час іх стварэння. Асабліва яго цікавіла форма насыпаў. Розныя па форме курганы даследчык адносіў да розных эпох [5, с. 19]. Актыўна А. М Семянтоўкі абмяркоўваў звесткі, атрыманыя падчас раскопак М. Ф. Кусцінскага. Праз аналіз рэчаў ён спрабаваў асэнсаваць сацыяльны статус пахаваных (асабліва што датычыцца пахаванняў са зброяй) [5, с. 25].

А. М. Семянтоўскі звяртаў увагу і на жаночы пахавальны інвентар. Назіраючы за раскопкамі іншых аматараў-археолагаў, ён змог абагульніць звесткі па знаходках жаночага пахавальнага інвентару і зрабіў выснову, што больш за ўсё такія рэчы сустракаюцца на захадзе сучаснай Віцебскай вобласці, бліжэй да Балтыйскага мора (згодна з А. М. Семянтоўскім – Інфляндскія ўезды Віцебскай губерні, Ковеньская губернія і інш.). Часткова «жаночыя рэчы» усё ж сустракаюцца і ў «Белорусских уездах Витебской и Могилевской губерний». У дачыненні да гэтых рэчаў даследчыкам было выказана меркаванне наконт таго, што яны аналагічныя рэчам са Швецыі і Даніі. Гэта сведчыць пра зносіны мясцовых жыхароў са Скандынавіяй [5, с.

25]. Такім чынам, хоць шмат у чым памылкова, але А. М. Семянтоўскі паспрабаваў прымяніць метады картаграфічны, храналагічны і метад аналогіі ў дачыненні да вывучаемых помнікаў і рэчаў. Ён выкарыстаў асобныя элементы жаночага строю ў якасці храналагічнага індыкатара а таксама паказчыкаў гандлёвых сувязяў.

Актывізацыю археалагічнага даследавання курганных старажытнасцяў другой паловы VIII – пачатку XI ст. можна звязаць з актывізацыяй археалагічнай навукі на тэрыторыі Беларусі падчас падрыхтоўкі IX археалагічнага з’езду. Па-сапраўднаму навуковыя археалагічныя даследаванні пачаліся з тэрыторыі Браслаўскага Паазер’я, і звязаны яны з прозвішчам Ф. В. Пакроўскага. Улетку 1893 г. у межах падрыхтоўкі да IX археалагічнага з’езду былі праведзены буйныя раскопкі курганных могільнікаў Браслаўскага Паазер’я. Усяго Ф. В. Пакроўскім было даследавана каля 56 курганоў у 6 могільніках: Заборныя Гумны – 6, Ахрэмаўцы (Бяльмонты) – 7, Рацкі Бор – 20, Опса – 11, Даўбор – 8, Вусце (Богіна) – 4. Вынікі гэтых раскопак выкладзены ў артыкуле «Курганы на границе современной Литвы и Белоруссии», які надрукаваны ў зборніку «Труды IX археологического съезда в Вильне. Т. 1» (1895) [3].

Дадзены артыкул адрозніваецца грунтоўным апісаннем пабудовы курганных насыпаў, іх прывязкай да мясцовасці, апісаннем пахавальнага абраду і знаходак са спробай прывесці аналогіі. Адзіным недахопам можна лічыць тое, што артыкул не ўтрымлівае ў сабе графічных дадаткаў, толькі некаторыя замалёўкі рэчаў. Для свайго часу гэтая праца мела дастаткова вялікі метадычны і аналітычны характар.

Акрамя палявых даследаванняў Ф. В. Пакроўскі займаўся складваннем археалагічных карт. Звесткі пра пералічаныя вышэй помнікі змешчаны ў «Археологической карте Ковенской губернии» (1899). Апісанне даецца могільнікам Рацкі Бор, Заборныя Гумны, Бяльмонты, Опса [4, с. 25, 27, 26, 31].

У сваіх публікацыях Ф. В. Пакроўскі даў падрабязнае апісанне выяўленых і даследаваных ім помнікаў, што з’яўляецца добрай крыніцай для даследавання пахавальнага абраду і рэканструкцыі жаночага пахавальнага строю насельніцтва Беларускага Падзвіння. Даследчык правёў значную тэарэтычную працу па абагульненню назапашанага ім матэрыялу, спрабаваў устанавіць храналогію вывучаных помнікаў, правесці аналогіі. Яго археалагічныя карты Ковенскай і Віленскай губерні вельмі падрабязныя. Шмат сваіх знаходак Ф. В. Пакроўскі перадаваў на шматлікія археалагічныя выставы, указваючы помнікі, адкуль яны паходзілі.

Значныя часткі публікацый даследчыка прысвечаны пытанням храналогіі і этнакультурнай прыналежнасці даследаваных ім помнікаў. Найбольшы акцэнт у адказах на гэтыя пытанні Ф. В. Пакроўскі рабіў на асаблівасцях пахавальнай абраднасці. У выніку помнікі з крэмацыяй адносіў да літоўскіх старажытнасцяў, а помнікі з інгумацыяй – да пахавальных помнікаў дрыгавічоў [3, с. 176, 180, 184]. Карыстаючыся метадам аналогіі ў дачыненні да аналізу пахавальнага інвентару, ён таксама рабіў некаторыя высновы наконт этнасу. Як прыклад, рэчы з могільніка Рацкі Бор, на думку даследчыка, мелі аналогіі ў прыбалтыйска-фінскіх старажытнасцях («людвікаўскі могільнік»), што сведчыць на карысць думкі пра тое, што курганы ў Рацкім Бары належалі старажытным літоўцам [3, с. 196].

Такім чынам, Ф. В. Пакроўскі таксама выкарыстоўваў элементы жаночага строю ў якасці этнакультурнага маркёра, аднак разам з дадзенымі пра традыцыі пахавальнай абраднасці і інфармацыяй пра сучаснае насельніцтва вакольных да раскапанага помніка мясцін (выкарыстанне «метаду пераносу сучасных межаў на межы старажытныя»).

**Высновы.** Перад сучаснымі даследчыкамі стаяць такія ж пытанні, як і перад даследчыкамі другой паловы XIX ст.: пытанні храналогіі вывучаемых старажытнасцяў, іх этнакультурнай прыналежнасці, тэрыторыі рассялення носьбітаў тых ці іншых культурных традыцый, гандлёвых сувязяў розных рэгіёнаў.

На сучасным этапе развіцця археалагічнай навукі даследчык, паралельна з пабудовай нейкіх гістарычных рэканструкцый, усё больш павінен займацца «рэчазнаўствам»: аналізаваць рэч як найбольш трывалую крыніцу інфармацыі. З выкарыстаннем метадаў іншых навук у аналізе рэчаў, здабытых падчас археалагічных

даследаванняў, значна пашырыліся магчымасці і колькасць здабытай інфармацыі. Зараз адказаць на пытанне пра храналогію можна не толькі дзякуючы выяўленню на помніку нумізматычных матэрыялаў, як гэта было ў XIX ст., але і дзякуючы існаванню распрацаваных «тыпалагічна-хрананалагічных» класіфікацый.

Ля вытокаў сучасных падыходаў да пошуку адказаў на праблемныя навуковыя пытанні ў археалогіі стаялі прадстаўнікі «памешчыцкага этапу». Некаторыя з даследчыкаў зрабілі значны ўклад у развіццё сучаснай археалогіі, некаторыя з прадстаўнікоў гэтага перыяду зусім не займаліся асэнсаваннем таго, што імі было зроблена, і пакінулі пра сваю дзейнасць толькі кароткія ўзгадкі ў літаратуры. Аднак менавіта імі быў пакладзены старт назапашванню матэрыялаў для рэканструкцыі жаночага строю насельніцтва Беларускага Падзвіння другой паловы VIII – пачатку XI ст. А праз аналіз жаночага строю і яго асобных элементаў, можна даць адказ на пытанні, якія цікавілі як даследчыкаў XIX ст., так і сучасных археолагаў: этнас, сувязі, арэал, храналогія.

**Бібліяграфічныя спасылкі:**

1. Каханоўскі Г. А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI–XIX стст. Мінск : Навука і тэхніка, 1984.
2. Плавінскі М. А., Плавінскі А. М., Плавінскі У. А., Тарасевіч В. М.,. Макоўская В. А, Астаповіч Э. А. Даследаванні комплекса археалагічных помнікаў каля вёскі Наўры Мядзельскага раёна Мінскай вобласці ў 2017 годзе // Сахаровские чтения 2018 года: экологические проблемы XXI века: материалы 18-й международной научной конференции, Мінск, 17–18 мая 2018 г., в 3 ч. 2018. Ч. 1. С. 94–95.
3. Покровский В. Ф. Курганы на границе современной Литвы и Белоруссии // Труды IX археологического съезда в Вильне. 1895. Т.1. С. 166–220.
4. Покровский Ф. В. Археологическая карта Ковенской губернии. Вильна: Типография А. Г. Сыркина, 1899.
5. Сементовский А. М. Белорусские Древности. СПб., 1890.
6. Тышкевич Я. П. О древних могилах в Минской губернии и Литве // Сын Отечества: журнал истории, политики, словесности, наук и художеств. 1838. Т. 6. С. 51–58.
7. Pławinski M., Pławinski A., Pławinski U., Tarasiewicz W., Makouskaja W., Astapowicz E. Badania zespołu stanowisk archeologicznych koło wsi Nawry, rej. miadzielski obw. Miński, w 2017 roku // Badania archeologiczne w Polsce środkowowschodniej, zachodniej Białorusi i Ukrainie w roku 2017: streszczenia referatów XXXIV konferencji. 2018. S. 38.
8. Tyszkiewicz E. Badania archeologiczne nad zabytkami przedmiotow sztuk i rzemiosl i t.d. w dawnej Litwe i Rusi Litewskiej. Wilno, 1850.
9. Tyszkiewicz K. O kurhanach na Litwie i Rusi zachodniej. Berlin, 1868.

УДК 94"1914/1918":008(476)

## ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ МЕСЦАЎ ПАМЯЦІ Ў КАНТЭКСЦЕ КУЛЬТУРНАГА ЛАНДШАФТА ПОЛЯ БІТВЫ

**А. Дз. Якубінская**

*Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт,*

*пр. Незалежнасці, 65, 220013, г. Мінск, Беларусь;* alesia-78@yandex.ru

Культурны ландшафт – гэта асаблівы тып спадчыны, што забяспечвае ўзаемадзеянне, узаемапранікненне і ўзаемазалежнасць прыродных і культурных кампанентаў. Воінскія пахаванні Першай сусветнай вайны ўвасабляюць ў сабе традыцыйныя рысы сакральных тэрыторый асацыятыўнага культурнага ландшафту сельскай мясцовасці паўночна-заходняй Беларусі. Воінскія некропалі Мядзельскага раёна дазваляюць ажыццявіць аб’ектывацыю падзей Нарацкай аперацыі 1916 года.

***Ключавыя словы:*** асацыятыўны культурны ландшафт; воінскія некропалі; Мядзельскі раён; Нарацкая аперацыя.